РАДА БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ

---

## **Мэдаль за баявыя заслугі**

## **Статут узнагароды**

1. Мэдаль за баявыя заслугі (далей – “Мэдаль”) зьяўляецца ўзнагародай, якая мае пераемнасьць ад ордэну “Virtuti Militari”, які быў заснаваны ў 1792 годзе і быў найстарэйшай гістарычнай вайсковай узнагародаю беларускае дзяржавы. Адроджаная і зьмененая ўзнагарода адлюстроўвае каштоўнасьці Беларусі як незалежнай дэмакратычнай рэспублікі.

2. Мэдаль надаецца за асабістую адвагу, праяўленую ў абставінах, зьвязаных з рызыкай для жыцьця і з абаронай свабоды, сувэрэнітэту й дэмакратычнага канстытуцыйнага ладу Беларусі на грунце ідэалаў 25 сакавіка, у прыватнасьці, пры выкананьні вайсковага і службовага абавязку, у баях і пры выкананьні спэцыяльных заданьняў у нацыянальных інтарэсах Беларусі.

3. Мэдаль можа ўручацца:

- Удзельнікам беларускіх збройных сілаў і службаў, прыроўненых да вайсковых, у тым ліку беларускіх партызанскіх аддзелаў і беларускіх вайсковых аддзелаў у складзе замежных войскаў,

- Беларусам (як беларускім грамадзянам, так і асобам, якія належаць да беларускага народу, ня будучы беларускімі грамадзянамі), якія ў асабістай якасьці ваююць у шэрагах замежных войскаў і службаў па-за межамі беларускіх вайсковых аддзелаў,

- Замежным вайскоўцам, якія адпавядаюць крытэрам, вызначаным у Артыкуле 2 гэтага Статуту, і якія істотна спрыялі выкананьню вайскоўцамі-беларусамі збройнае місіі ў адпаведнасьці з крытэрамі, вызначанымі ў Артыкуле 2 гэтага Статуту,

- Цывільным асобам-некамбатантам, якія адпавядаюць умовам Артыкулу 2 гэтага Статуту.

4. Мэдаль надаецца Дэкрэтам Старшыні Рады БНР.

4.1 Сьпісы кандыдатаў на ўзнагароджаньне рыхтуюцца Камісіяй па ўзнагароджаньнях пры Радзе БНР, разглядаюцца і зацьвярджаюцца Старшынёю Рады БНР і Заступнікамі Старшыні Рады БНР у адпаведнасьці з Статутам Камісіі па ўзнагароджаньнях пры Радзе БНР.

4.2 Камісія па ўзнагароджаньнях пры Радзе БНР рыхтуе сьпісы кандыдатаў на ўзнагароджаньне на аснове прадстаўленьняў камандэраў адпаведных вайсковых частак або ўласнай інфармацыі.

4.2.1 Прадстаўленьні да ўзнагароджаньня падаюцца ў Камісію па ўзнагароджаньнях пры Радзе БНР у адвольнай пісьмовай або электроннай форме.

4.2.2 Прадстаўленьне да ўзнагароджаньня Мэдалём павінна зьмяшчаць агульную інфармацыю пра кандыдата на ўзнагароджаньне і пра характар учынка, за які мае адбыцца ўзнагароджаньне. У рамках аднаго прадстаўленьня могуць быць прадстаўленыя да ўзнагароды як адзін, так і некалькі кандыдатаў.

4.3 Узнагароджаньне Мэдалём можа адбывацца пасьмяротна.

4.4 Узнагароджаньне Мэдалём, якое ўжо адбылося, можа быць скасаванае, калі высьветліцца няпраўдзівасьць інфармацыі, якая сталася падставай для ўзнагароджаньня, альбо калі ўзнагароджаная асоба дыскрэдытуе сябе дзеяньнямі, якія супярэчаць ідэалам вольнай і дэмакратычнай Беларусі ў адпаведнасьці з прынцыпамі 25 сакавіка.

4.4.1 Касаваньне ўзнагароджаньня можа быць ініцыяванае Камісіяй па ўзнагароджаньнях пры Радзе БНР, патрабуе ўхваленьня з боку Старшыні Рады БНР і Заступнікаў Старшыні Рады БНР, адбываецца дэкрэтам Старшыні Рады БНР.

5. Асобам, узнагароджаным Мэдалём, выдаецца сэртыфікат усталяванага ўзору.

6. Старэйшаю ўзнагародай адносна Мэдаля зьяўляецца тытул кавалера (дамы) Ордэну Жалезнага рыцара. Мэдаль носіцца на левым баку грудзі, пасьля ордэнскіх знакаў.

7. Выгляд Мэдалю адлюстраваны ў эскізе, які зьяўляецца дадаткам да гэтага Статуту.

7.1 Мэдаль увесь зь белага (для шэрагоўцаў і падафіцэраў) або жоўтага (для афіцэраў, паўторнага ўзнагароджаньня шэрагоўцаў і падафіцэраў або за асаблівыя заслугі) мэталу, авальнае формы. На ліцавым баку выява гістарычнага гербу “Малая Пагоня” (рука вершніка з гербу “Пагоня”, якая трымае меч) і стужкі з трыма палосамі, якая ўвасабляе беларускі бел-чырвона-белы сьцяг. На адваротным баку надпіс: “Virtute et Gladio” (“Адвагаю і мячом” на лацінскай мове) і індывідуальны нумар мэдалю. Пры пазначэньні нумару мэдаля ў сэртыфікаце для мэдалёў жоўтага мэталу побач з нумарам робіцца пазнака “(А)”. У выпадку нашэньня калодак, на калодцы для мэдаля жоўтага мэталу пасярэдзіне можа дадавацца вузкая вэртыкальная лінія залатога колеру.

7.2 Стужка Мэдалю складаецца з вэртыкальных палосаў наступных колераў і разьмешчаных у наступным парадку: вельмі вузкая белая, шырокая кармазынавая, вельмі вузкая белая.

8. Гэты Статут уваходзіць у жыцьцё дня 21 студзеня 2023 году.

**Зацьверджана:**

**Івонка Сурвілла,**
**Старшыня Рады БНР**

**21 студзеня 2023 г.**

## ДАДАТАК

## МЭДАЛЬ ЗА БАЯВЫЯ ЗАСЛУГІ: ЭСКІЗ УЗНАГАРОДЫ

Для шэрагоўцаў:




Для афіцэраў, паўторнага ўзнагароджаньня або за асаблівыя заслугі:




**Зацьверджана:**

**Івонка Сурвілла,**
**Старшыня Рады БНР**

**21 студзеня 2023 г.**

Сэртыфікат (дыплём) да Мэдаля за баявыя заслугі: узор

**РАДА БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ**

## МЭДАЛЬ ЗА БАЯВЫЯ ЗАСЛУГІ




Мэдаль за баявыя заслугі,
усталяваны Статутам ад 21 студзеня 2023 году,
нададзены

______________________________________________

паводле Дэкрэту Старшыні Рады БНР ад ____________________

па прадстаўленьні ____________________________________.

Мэдаль за нумарам ________________

**СТАРШЫНЯ РАДЫ БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ**

**АД КАМІСІІ ПА ЎЗНАГАРОДЖАНЬНЯХ ПРЫ РАДЗЕ БНР**

**Івонка Сурвілла**